Беларускі калегіюм

Спэцыялізацыя: журналістыка

*Пра праграму:*
Наяўнае становішча беларускіх СМІ адзначана вострым недахопам новых твараў і сьвежых праектаў. Творчаму аднаўленьню замінае мэнтальная і прафэсіянальная інэрцыя часоў ідэялягічнага супрацьстаяньня, калі “правільная” пазыцыя падавалася больш істотнай за валоданьне прафэсійнымі тэхнікамі і адэкватнае разуменьне лякальнай сытуацыі. Часы майстроў улётак і праклямацый скончыліся. Насьпела пара новых аўтараў – тэхнічных профі, здольных перамагаць ў канкурэнтнай барацьбе на сучасных мэдыя-прасторах.
Агульнай мэтай працы ў межах журналісцкай праграмы БК зьяўляецца не падрыхтоўка “жаўнераў інфармацыйнай вайны”, а атрыманьне слухачамі апэратыўных ведаў у галіне найноўшых мэдыя-тэхналёгіяў разам з агульнай арыентацыяй ў падставовых трэндах інфармацыйнай прасторы пост-індустрыяльнага грамадзтва. Мы выкладаем не ідэялёгіі, а эфектыўныя крэатыўныя тэхнікі ў айчынным кантэксьце.

Мэдыя-праграма БК мае сваёй мэтай спрыяньне асабістай самарэалізацыі слухачоў ў якасьці “універсальных журналістаў” – самастойных творчых адзінак, здольных аднолькава пасьпяхова працаваць як у якасьці фрылансера, так і ў складзе камандных праектаў. Асноўная ўвага надаецца практычным заняткам і пэрсанальнай камунікацыі з лепшымі мэдыя-прафесіяналамі краіны.

Сыстэма адукацыі ў межах праграмы ёсьць арыентаванай на дзьве суполкі патэнцыйных спажыўцоў: пачаткоўцаў (паўнавартасны курс з разлікам на адзін навучальны год; заняткі ў фармаце лекцыяў/сэмінараў і індывідуальных tutorials) і асобаў з пэўным досьведам працы (творчыя бліц-сэмінары і практыкумы на 7-10 заняткаў).

*Куратар спэцыялізацыі:* Максім Жбанкоў

**<u>Журналістыка: падставовы курс</u>**
Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца асобы, якія ня маюць досьведу ў журналістыцы (ці маюць мінімальны)

**Выкладчыкі**: Андрэй Бастунец, Мікола Дзябёла, Максім Жбанкоў, Марына Загорская, Юрась Карманаў, Яніна Мельнікава, Павал Сьвярдлоў і інш.

**Курсы лекцыяў**
Уводзіны ў тэорыю камунікацыі
Прававое рэгуляваньне СМІ
Журналісцкая этыка

**Практыка мас-мэдыяў: журналісцкія тэхнікі:**
Інфармацыйныя жанры
Жанры: зацемка
Жанры: інтэрвію
Жанры: журналісцкае расьледваньне
Жанры: аналітычны артыкул
Жанравыя трансфармацыі інфармацыі

**Спэцкурсы**
Стылістыка жанраў

Мэдыі і Public Relations
Новыя мэдыі і грамадзянская журналістыка

**Майстар-клясы прафэсыяналаў**

**Журналісцкія практыкумы**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца асобы, якія маюць базавы досьвед ў журналістыцы, пацьверджаны публікацыямі ў мэдыя (ня менш за 5 публікацый)

**Культурніцкая аналітыка** (Максім Жбанкоў)

**Інтэрнэт-журналістыка** (Севярын Квяткоўскі)

**Умовы паступленьня:**

***Журналістыка: падставовы курс***
1. Творчае заданьне
2. Пры наяўнасьці — уласныя тэксты
3. Запоўненая анкета апліканта

*Зьвярніце увагу: да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца асобы, якія ня маюць досьведу ў журналістыцы (ці маюць мінімальны)*

***Журналісцкія практыкумы***
1. 5-7 журналісцкіх публікацыяў
2. Запоўненая анкета апліканта
3. Матывацыйны ліст.

*Зьвярніце ўвагу: да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца асобы, якія маюць базавы досьвед ў журналістыцы, пацьверджаны публікацыямі ў мэдыя.*

**Плян набора:**
*Журналістыка: падставовы курс* — 15-20 чалавек па выніках сумоўя і выкананьня ўступных патрабаваньняў;
*Журналісцкія практыкумы* – 7-10 чалавек па выніках сумоўя і выкананьня ўступных патрабаваньняў.